ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

ЛЮТЫ

Віцебск 2013

ГУ "ВИТЕБСКАЯ ОБЛАСТНАЯ БИБЛИОТЕКА ИМ. В. И. ЛЕНИНА"
Отдел библиотековедения

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Люты

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2013

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К 90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : люты : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2013. – 23 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2013

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Люты

Інфармацыйнае паведамленне

2013 г.

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Камп'ютарная вёрстка *А. В. Юпатавай*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Надрукавана на ксераксе ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна"
210601, Віцебск, Леніна, 8а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

Полацкі веснік. – 2013. – 26 лют. – С. 2.

ЛІТАРАТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ

У межах ХХ Міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу ў Мінску прайшоў 52-гі Нацыянальны конкурс «Мастацтва кнігі», на які было пададзена 175 работ. У ліку лепшых кніг Беларусі журы выбрала кнігу-альбом «Полацк. 1150».

Полацкі веснік. – 2013. – 12 лют. – С. 1.

Папоўніўся творчы рахунак віцебскай пісьменніцы *Стасі Наркевіч (Настассі Лазебнай)*. У мінскім выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла яе новая казка «Віялета, бабулечка і чароўны дроцік» – першая з цыкла, які будзе складацца з пяці кніжак-казак. Аўтарка адрасуе свой твор дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту.

Народнае слова. – 2013. – 9 лют. – С. 8.

Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» вядомага беларускага пісьменніка і драматурга *Уладзіміра Караткевіча*, ураджэнца Оршы, выдадзена ў Вялікабрытаніі на англійскай мове.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 16 февр. – С. 2.

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА…….4

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……..5

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 28 лютага 2013 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, аддзелам культуры Міёрскага райвыканкама, РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна, Бешанковіцкай, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Дубровенскай, Лепельскай, Лёзненскай, Пастаўскай, Сенненскай, Полацкай, Ушацкай, Шаркаўшчынскай, раённых сетак бібліятэк, Віцебскай, Полацкай і Наваполацкай гарадскіх сетак бібліятэк.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

7 лютага ў Докшыцкім раённым Доме рамёстваў адкрылася персанальная выстаўка «Мир прекрасного» майстра народнага клуба *Марыны Зайцавай* (габелены, аплікацыя, вышыўка).

З **11** па **21 лютага** ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры прайшлі абласныя курсы павышэння кваліфікацыі спецыялістаў устаноў культуры па традыцыйных беларускіх рамёствах па тэме «Ткацтва». У праграме: знаёмства з гісторыяй ткацтва на Беларусі, вывучэнне розных тэхнічных прыёмаў, азнаямленне з лялечным тэатрам «Батлейка» на абласной выстаўцы народнай творчасці АМЦНТ, абмен вопытам работы спецыялістаў устаноў культуры па традыцыйных беларускіх рамёствах.

Віцебскі АМЦНТ

«На пароге весны» – так называецца выстаўка работ выкладчыкаў і выпускнікоў Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа, якая з **15 лютага** працавала ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці.

Віцебскі АМЦНТ

Выстаўка работ настаўніка СШ № 1 г. Докшыцы *Таццяны Бука* і яе вучняў «Цветы среди зимы» прадстаўлена ў Шаркаўшчынскім Доме рамёстваў (вышыўка рознакаляровымі стужкамі).

Народнае слова. – 2013. – 28 лют. – С. 16.

З **22** па **28 лютага** ў Талачынскім раённым Доме рамёстваў працавала выстаўка работ майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Зімовыя мары».

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

Полацкія майстры з народнага клуба лапікавага шыцця «Рошва» Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур прымаюць удзел у новым міжнародным творчым праекце «Планета Земля», ініцыятарам якога стаў краснадарскі клуб «Южная палитра». Яго мэта – прыцягнуць увагу грамадства да праблем экалогіі.

Выстаўка работ мастака з Баранавіч *Алеся Фалея* адкрылася ў Цэнтры сучаснага мастацтва (жывапіс, графіка, арт-аб'екты, скульптура, мастацкая коўка).

Витебский проспект. – 2013. – 14 февр. – С. 19.

У выставачнай зале дзіцячай мастацкай школы № 1 г. Віцебска экспанавалася выстаўка работ удзельнікаў Міжнароднага дзіцяча-юнацкага плэнера, прысвечанага 200-годдзю Айчыннай вайны 1812 года і 1150-годдзю Смаленска (прайшоў летам мінулага года). Удзел у творчай акцыі прынялі 46 навучэнцаў з Расіі, Латвіі і Беларусі, нашу краіну прадстаўлялі выхаванцы Віцебскай ДМШ № 1 і ДМШ г. Оршы.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 19 февр. – С. 2.

Прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд атрымаў у падарунак карціну віцебскага мастака *Алега Скавародкі* «Прогулка». Гэты прэзент кіраўніку еўрапейскай дзяржавы перадаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Францыі П. Латушка.

У Мастацкай галерэі Полацка ў **лютым** працавала фотавыстаўка *Ігара Супранёнка* «Полацк – Парыж – Полацк».

У Мастацкім музеі Віцебска **22 лютага** адкрылася выстаўка мастака *Л. Анцімонава* «Рэквием» (жывапіс, графіка).

Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва **27 лютага** запрасіў на адкрыццё выстаўкі работ студэнткі кафедры дызайна ВДТУ *Валерыі Гарбачовай*, а з **28 лютага** пачала работу выстаўка твораў славацкага мастака *П. Полага* «Адкрытыя лёсы».

http://news.vitebsk.cc/2013/02/25/prezidentu-frantsii-podarili-kartinu-vitebskogo-hudozhnika/

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

16 лютага адзначыла свой юбілей артыстка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа *Ларыса Антонаўна Антосева*.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 16 февр. – С. 9.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Значную падзею – **75-годдзе з дня ўтварэння Віцебскай вобласці** – адзначылі **1 лютага** ў КЗ «Віцебск» з удзелам кіраўніцтва рэгіёна, шырокай грамадскасці, ветэранаў, прадстаўнікоў працоўных калектываў. Да юбілею прымеркавалі і ўшаноўванне лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны» за 2012 год.

Рашэннем абласнога выканаўчага камітэта № 35 ад 26.01.2013 г. ганаровае званне ў намінацыі «Культура, мастацтва, духоўнае адраджэнне» прысвоена:

– *Вакар Людміле Уладзіміраўне* – вядучаму метадысту дзяржаўнай установы «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці», г. Віцебск;

– *Коўленай Ірыне Віктараўне* – намесніку генеральнага дырэктара па культурна-масавай рабоце дзяржаўнай установы «Цэнтр культуры "Віцебск"»;

– *Кандрацюку Аляксандру Іванавічу* – дырэктару ўстановы адукацыі «Наваполацкі дзяржаўны музычны каледж».

11 лютага ў зале абласной філармоніі адбылося пасяджэнне **выніковай калегіі ўпраўлення культуры аблвыканкама,** на якім былі разгледжаны наступныя пытанні:

– вынікі работы органаў і ўстаноў культуры і мастацтва вобласці ў 2012 годзе і задачах на 2013 год;

– прысуджэнне прэмій Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва (па выніках

работы за 2012 год) (згодна рашэння аблвыканкама ад 9 верасня 2004 г. № 563).

Ва ўрачыстай абстаноўцы былі ўганараваны кіраўнікі дзяржаўных устаноў культуры і навучальных устаноў мастацтваў вобласці, лаўрэаты прэмій аблвыканкама за высокія творчыя дасягненні:

– у намінацыі «Лепшая музычная школа» – Аршанскай дзіцячай школе мастацтваў № 1;

– у намінацыі «Лепшы раённы (гарадскі) Дом культуры» – Міёрскаму раённаму Дому культуры, Расонскаму раённаму Дому культуры;

– у намінацыі «Лепшая раённая (гарадская) бібліятэка» – Аршанскай цэнтральнай раённай бібліятэцы;

– у намінацыі «Лепшы музей (філіял музея)» – навукова-даследчай установе культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік»;

– у намінацыі «Лепшы Цэнтр, Дом рамёстваў» – Лепельскаму раённаму Дому рамёстваў і Гарадоцкаму раённаму Дому рамёстваў і фальклору;

– у намінацыі «Лепшы раённы метадычны цэнтр» – Міёрскаму раённаму арганізацыйна-метадычнаму Цэнтру народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы;

– у намінацыі «Лепшая дзіцячая бібліятэка» – Лёзненскай дзіцячай бібліятэцы;

– у намінацыі «Лепшы сельскі Дом культуры» – Відзаўскаму Дому культуры Браслаўскага раёна, Лаўжанскаму сельскаму Цэнтру культуры і дасуга Шумілінскага раёна;

– у намінацыі «Лепшая сельская бібліятэка» – Машканскай сельскай бібліятэцы Сенненскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, Варанцэвіцкай сельскай бібліятэцы Талачынскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.

Аблвыканкам заснаваў сваю прэмію па падтрымцы таленавітай

МАСТАЦТВА

МУЗЫКА

21 лютага ў абласной філармоніі прайшоў творчы вечар *Барыса Грабеншчыкова* «Встреча глаза в глаза», якім спявак і музыкант завяршыў гастрольны тур па Беларусі.

28 лютага ў КЗ «Віцебск» на сольны канцэрт «Ты все увидишь сам» запрасіў прыхільнікаў сваёй творчасці малады віцебскі артыст *Глеб Лапіцкі*.

Дзесяцікласніца Цяпінскай школы Чашніцкага раёна *Вольга Шамархан* стала ўладальніцай Гран-пры рэспубліканскага творчага конкурсу юных вакалістаў «Звонкая раніца-3», які прайшоў у Нацыянальным аздараўленчым цэнтры «Зубренок».

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 16 февр. – С. 2.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

Жывапіс *Галіны Васільевай* прадстаўлены ў Цэнтры сучаснага мастацтва. У экспазіцыі – эцюды, беспрадметныя кампазіцыі, прысвечаныя Віцебску, Полацку.

У Арт-цэнтры Марка Шагала адкрылася выстаўка «Мой Иерусалим» вядомага фатографа з Магілёва *Аляксандра Ліціна*. Яго работы экспанаваліся ў розных гарадах Беларусі і Расіі, а таксама Польшчы, Германіі і Аўстрыі. На выстаўцы ў нашым горадзе прадстаўлены 35 фатаграфій, на якіх занатаваны фрагменты гарадскога жыцця старажытнага горада.

Народнае слова. – 2013. – 16 лют. – С. 7.

У Мастацкім музеі Віцебска працавала выстаўка фітакалажа «Незнакомка», арганізаваная Міжнароднай творчай асацыяцыяй фітакалажыстаў «Флориссима», і народнага клуба аматараў фларыстыкі «Анюта».

Народнае слова. – 2013. – 14 лют. – С. 16.

выстаўкі пад назвай «У пошуках Атлантыды. Межава». На імпрэзу сабраліся мастакі і аматары жывапісу. Амаль усе прадстаўленыя работы аўтары пісалі падчас пленэру ў ліпені 2012 года ў вёсцы Межава Аршанскага раёна.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 5 февр. – С. 2.

14 лютага ў Музеі Марка Шагала прайшла прэзентацыя гісторыка-краязнаўчай кнігі *Людмілы Хмяльніцкай* «Прогулки со старой картой». Да выдання прыкладаецца план Віцебска 1904 года.

Народнае слова. – 2013. – 28 лют. – С. 16.

19 лютага канцэртнай зале Полацкага Сафійскага сабора споўнілася 30 гадоў.

Полацкі веснік. – 2013. – 26 лют. – С. 2.

У гісторыка-краязнаўчым музеі Браслава ў **лютым** адкрылася выстаўка, прысвечаная тэатральнай культуры раёна. У экспазіцыі прадстаўлены матэрыялы аб першых згадках тэатральных прадстаўленняў на Браслаўшчыне, а таксама спробах арганізацыі беларускага аматарскага тэатра. Асобная частка экспазіцыі прысвечана дзейнасці народнага тэатра ў Браславе ў мінулым і на сучасным этапе.

http://www.braslav-star.by/2013/02/teatralnaya-gistoryya-brasla%D1%9Eshchyny/

Каля 70 мільёнаў рублёў прадугледжана ў абласным бюджэце на рамонт музея-сядзібы Васіля Быкава ў в. Бычкі Ушацкага раёна. Пачалася работа па аднаўленні экспазіцыі. Рэканструкцыя музея ўключана ў план мерапрыемстваў па святкаванні ў 2014 годзе 90-годдзя народнага пісьменніка Беларусі. Да юбілею нашага земляка адкрыецца яшчэ адзін мемарыяльны музей пад Мінскам у пасёлку Ждановічы. Жонка В. Быкава перадала ў дзяржаўную ўласнасць сямейную дачу. Яна стане філіялам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

Народнае слова. – 2013. – 16 лют. – С. 4.

творчай моладзі, лаўрэатамі якой па выніках 2012 года сталі 16 навучэнцаў школ і сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў культуры і мастацтва.

Народнае слова. – 2013. – 14 лют. – С. 10.

Навучэнцам Полацкай дзіцячай школы мастацтваў прысуджаны заахвочвальныя прэміі са спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Прэміі ў памеры паўтара мільёны рублёў і спецыяльныя пасведчанні атрымалі юныя музыкі – лаўрэаты VI Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І. Жыновіча. *Даніла Асяпёнак* і *Яўген Сарокін* атрымалі дыпломы II ступені, *Ганна Мацвейка* і *Настасся Пуціліна* – дыпломы III ступені.

Полацкі веснік. – 2013. – 12 лют. – С. 2.

13 лютага ў вобласці прайшлі асноўныя мерапрыемствы ў гонар 95-годдзя з дня нараджэння Пятра Машэрава. Ну вуліцы Замкавай у Віцебску адбылося ўскладанне кветак да помніка дзяржаўнага дзеяча Беларусі, Героя Савецкага Саюза, Героя Сацыялістычнай Працы. Удзел ва ўрачыстай цырымоніі прынялі прадстаўнікі абласнога і гарадскога кіраўніцтва, грамадскіх аб’яднанняў, жыхары Віцебска. У гэты ж дзень у ВДУ імя П. М. Машэрава ў гонар славутага земляка адбыўся ўрачысты вечар. У Віцебскім Палацы дзяцей і моладзі правялі першыя абласныя краязнаўчыя чытанні «Пётр Машэраў: жыццё, лёс, памяць», а 12 лютага ў абласным краязнаўчым музеі адкрылася фотадакументальная выстаўка, у Расонскім музеі баявой садружнасці – выстаўка «Вечной памятью жив». Ва ўсіх гарадах і райцэнтрах вобласці адбыліся ўрачыстыя мерапрыемствы.

15 лютага адзначалася 24-я гадавіна вываду савецкіх войскаў з Афганістана. У гэты дзень у Віцебску ля мемарыяльнага комплексу «Боль» адбыўся мітынг-рэквіем з удзелам кіраўнікоў вобласці, ветэранаў вайны ў Афганістане. **20 лютага** ў абласной філармоніі прайшоў вечар, прысвечаны Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і Дню абаронцаў

Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Тэатральна-музычная студыя «Паралелі», створаная пры цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна, пад кіраўніцтвам *Ганны Касцянкі* прадставіла новы спектакль – мюзікл «Обожжённая сага», сваё майстэрства падарылі гледачам удзельнікі танцавальнага калектыву Віцебскага каледжа мастацтваў. Работнікі ўстаноў культуры вобласці прынялі актыўны ўдзел у арганізацыі вечароў памяці, сустрэч з воінамі-інтэрнацыяналістамі, святочных канцэртаў.

23 лютага ў КЗ «Віцебск» адбыўся ўрачысты сход і канцэрт, прысвечаны Дню абаронцаў Айчыны і 95-годдзю Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

27 лютага ў Міёрскай дзіцячай музычнай школе адбылася выніковая нарада работнікаў культуры, на якой са справаздачным дакладам аб выніках работы за 2012 год і асноўных напрамках галіны культуры на 2013 год выступіў начальнік аддзела культуры райвыканкама А. С. Тронькін. Лепшым работнікам культасветустаноў па выніках работы за 2012 год былі ўручаны граматы і грашовыя прэміі.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

КУЛЬТУРНЫ ТУРЫЗМ

У межах рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь на 2011–2015 гады, з мэтай фарміравання адзінага іміджавага вобразу г. Полацка гарвыканкам абвясціў адкрыты конкурс «Турыстычны брэнд г. Полацка».

Полацкі веснік. – 2013. – 1 сак. – С. 2.

У канцы студзеня – пачатку лютага прадстаўнікі турыстычнай сферы Полаччыны наведалі некалькі знакавых міжнародных мерапрыемстваў. Начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Полацкага гарвыканкама *С. Красоўскі* прымаў удзел у выстаўцы **«Adventour-2012»**, якая праводзілася ў сталіцы Літвы Вільнюсе ў межах праекта «Бэла Дзвіна-2». У выніку было падпісана пагадненне з

даведачна-бібліяграфічнай рабоце.

У бібліятэках да Дня роднай мовы былі афармлены выставы-прагляды літаратуры «Мілагучная, шчырая, добрая мова» *(цэнтральная раённая бібліятэка, дзіцячая бібліятэка, Багушэўская гарпасялковая бібліятэка)*, фальклорнае падарожжа «Беларускі скарб» *(Ходцаўская сельская бібліятэка)*, урок беларусазнаўства «Родная мова – цудоўная мова» *(Студзёнкаўская сельская бібліятэка).*

13 лютага Машканская сельская бібліятэка сумесна з ЦРБ арганізавалі выстаўку аб жыцці і дзейнасці П. М. Машэрава да раённага мерапрыемства «У памяці застанецца навечна», якое адбылося ў в. Машканы.

Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк

Фальклорнае падарожжа «Беларускі скарб», прысвечанае Міжнароднаму дню роднай мовы *(Арэхаўская сельская бібліятэка)*.

Гадзіна мужнасці «Безвинные мученики войны» да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў *(Жарская сельская бібліятэка).*

Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк

У бібліятэках сістэмы на працягу месяца праходзілі мерапрыемствы, прымеркаваныя да 95-годдзя з дня нараджэння П. М. Машэрава: пазнавальная гадзіна «Заўсёды ў памяці народнай» *(Іёдская сельская бібліятэка*), урок выдатнай асобы «Обыкновенный необычный человек» *(Пашкоўская сельская бібліятэка)* і інш.

28 лютага Выніковы выязны семінар-практыкум работнікаў культуры, у ходзе якога дырэктар ЦБС *В. Э. Касевіч* расказала аб планах і перспектывах бібліятэчнай дзейнасці на 2013 год, адбыўся выезд у бібліятэкі аграгарадкоў Германавічы і Верацеі.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

30 студзеня ў абласным краязнаўчым музеі адбылося адкрыццё

Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк

12 лютага Юбілейны бенефіс экалагічнага клуба «Колокольчик» «Нам – 30 лет!» *(дзіцячая бібліятэка)*.

14 лютага Вечар-памяць «В их жизни был Афганистан» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк

15 лютага Паэтычная старонка «Светлы ручай кахання», прымеркаваная да Сусветнага дня закаханых *(Варапаеўская гарпасялковая бібліятэка)*. На сустрэчу былі запрошаны паэты *С. Аліхвер* і *У. Дзіско*.

21 лютага Літаратурна-музычная кампазіцыя «Пагавары са мной на мове…», прысвечаная Міжнароднаму дню роднай мовы *(дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі).* Удзел у мерапрыемстве прыняў паэт *І. М. Пракаповіч.*

Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк

14 лютага Паэтычны вечар «Влюбленным посвящаются стихи» з удзелам членаў літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне» *(цэнтральная раённая бібліятэка).*

14 лютага Паэтычны вечар «Дом шчаслівых сэрцаў» *(Новагаранская сельская бібліятэка)*.

15 лютага Літаратурна-музычная кампазіцыя да 24-й гадавіны вываду савецкіх войск з Афганістана «А пули еще прилетают оттуда» *(Гомельская сельская бібліятэка)*.

Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк

У **лютым** быў праведзены выніковы семінар для сельскіх бібліятэкараў, на якім былі вызначаны лепшыя бібліятэкі, пераможцы конкурсаў, дадзены метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі работы клубаў па інтарэсах і аматарскіх аб'яднаннях пры бібліятэках, па

Вільнюскім інфармацыйна-турыстычным цэнтрам аб распаўсюджванні інфармацыі аб Полацку як геаграфічным цэнтры Еўропы. С. Красоўскі ўдзельнічаў у Міжнародным турыстычна-інвестыцыйным форуме **«Смаленшчына-2013»**. Акрамя абмену вопытам, на мерапрыемстве ішла размова аб правядзенні ў Полацку форуму турыстычных арганізацый Саюзнай Дзяржавы пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму Беларусі. У міжнародным выставачным цэнтры на Кіпсале (Латвія) прайшла 20-я выстаўка-кірмаш **«Balttour-2013»**. У складзе дэлегацыі ад Віцебскай вобласці ў форуме прынялі ўдзел намеснік старшыні Полацкага гарвыканкама *С. Аляксеева* і эксперт праекта «Бэла Дзвіна-2» *І. Загрэкаў*.

Полацкі веснік. – 2013. – 1 сак. – С. 5.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КЛУБНАЯ СПРАВА

2 лютага ў ДУА «Талачынская сярэдняя школа № 2» прайшоў раённы адборачны тур конкурсу маладых выканаўцаў патрыятычнай песні «Песні юнацтва нашых бацькоў», прысвечаны 75-годдзю стварэння Віцебскай вобласці, у якім прынялі ўдзел асобныя выканаўцы Талачынскага ГДК, Высокагарадзецкага СК, Серкавіцкага СДК, Варанцэвіцкага СДК, Коханаўскага ГПДК.

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

У лютым у Міёрскім раёне пачаўся першы тур традыцыйнага агляду-конкурсу калектываў мастацкай самадзейнасці і народнага мастацтва «Беларусь – мая песня». **10 лютага** мерапрыемства прайшло на базе аграгарадка Чэрасы ў сельскім Доме культуры, **17 лютага** – на базе Дзісненскага гарадскога Цэнтра культуры, а **24 лютага** – у аграгарадку Цвеціна.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

15 і 20 лютага ў Бешанковіцкім і Расонскім раённых Дамах культуры прайшлі занальныя адборачныя туры абласнога конкурсу патрыятычнай песні «Песні юнацтва нашых бацькоў».

Віцебскі АМЦНТ

16 лютага ў актавай зале Дубровенскага РДК прайшоў раённы агляд-конкурс драматычных калектываў мастацкай самадзейнасці «Тэатральны вернісаж». Сярод дарослых трэцяе месца дасталася артыстам Дубровенскага СДК, другое – творчаму калектыву Баброўскага СДК, першае месца не прысуджалася. Сярод дзіцячых тэатральных калектываў лепшым стаў «Домовенок» з Дабрынскага СДК, другое месца занялі артысты Станіславоўскага СДК («Маски»), а трэцяе – «Каскад» з Каліноўскага СДК.

18 лютага ў аграгарадку Навасёлкі адбыўся першы конкурс беларускамоўных дзіджэяў, якія прадставілі ўсе сельскія Дамы культуры Пастаўскага раёна.

http://nspaper.by/2013/02/15/sessiya-oblastnogo-soveta-deputatov.html

20 лютага ў Чапукоўскім СДК Міёрскага раёна прайшоў юбілейны канцэрт, прысвечаны 5-годдзю са дня стварэння аграгарадка Чапукі. У святочнай канцэртнай праграме прынялі ўдзел лепшыя творчыя калектывы сельскага Дома культуры.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

21 лютага ў Цэнтры нацыянальных культур (КЗ «Віцебск», каб. 302) адбыўся вечар-сустрэча «Молодежь в диалоге культур», прысвечаная Міжнароднаму дню роднай мовы. Яго ўдзельнікі прадставілі свае краіны, расказалі пра асаблівасці нацыянальных культур.

Народнае слова. – 2013. – 19 лют. – С. 2.

У **лютым** у Глыбокім прайшоў справаздачны канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці гарадскога Дома культуры, удзел у мерапрыемстве прынялі дзясяткі юных і дарослых артыстаў.

Народнае слова. – 2013. – 19 лют. – С. 8.

10 гадоў споўнілася ансамблю народнай музыкі «Гагарынскія

бібліятэкі), «Усё жыцце – служэнне народу» *(Ноўкінская, Капцянская, Акцябрская сельскія бібліятэкі)*, віртуальная гадзіна «До боли кратким оказался век» *(Альгоўская сельская бібліятэка)*.

Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк

8 лютага Віктарына да 185-годдзя з дня нараджэння *Ж. Верна* «Капитан фантастических путешествий» *(сельская бібліятэка аграгарадка Верамееўшчына)*.

21 лютага Літаратурна-музычная кампазіцыя «Слава кніжцы беларускай!» *(сельская бібліятэка аграгарадка Асінторф)*.

22 лютага Ваенна-патрыятычнае свята «Нашей армии любимой день рожденья в феврале» *(сельская бібліятэка аграгарадка Сіпішчава)*.

27 лютага Тэматычны вечар, прысвечаны 620-годдзю г. Дуброўна, «Дубровеншчына: позірк праз стагоддзі» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк

7 лютага Адкрыццё выстаўкі вышытых карцін *В. М. Жарнасек* «Вышивка чувств» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

7 лютага Гістарычны час «Мінулае вучыць нас, як жыць» да 175-годдзя з дня нараджэння К. Каліноўскага *(Стараляднeнская сельская бібліятэка)*.

8 лютага Скайп-канферэнцыя «Проведение массовых мероприятий в рамках месячника “Человек с белой тростью”: из опыта работы», удзел у ёй прынялі людзі з абмежванымі магчымасцямі з Лепельскага раённага таварыства інвалідаў і г. Балахна Ніжагародскай вобласці (Расія) *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

21 лютага Літаратурна-музычная вечарына «Сэрцам роднага слова краніся» *(Стаская сельская бібліятэка)*.

26 лютага Слайд-экскурсія «По заповедным местам Березинского заповедника» *(дзіцячая бібліятэка)*.

Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк

15 лютага Да 24-й гадавіны выводу войск з Афганістана супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі выдалі кнігу «Испытание мужеством».

15 лютага Літаратурна-музычная кампазіцыя «В памяти живые», прысвечаная памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў *(Лявонішанская сельская бібліятэка)*.

28 лютага Тэматычныя вечары «Живая боль родной земли» *(Асвейская сельская бібліятэка)*, «У кожным сэрцы вогнішча Асвеі» *(Боркавіцкая сельская бібліятэка),* прысвечаныя 70-годдзю Асвейскай трагедыі.

Віцебская раённая сетка публічных бібліятэк

4 лютага Літаратурнае падарожжа «Повязь традыцый і навізны», прысвечанае рамесніцкай культуры беларусаў *(Курынская сельская бібліятэка).*

15 лютага Дзень памяці «Жывая памяць Афгана» *(Вымнянская сельская бібліятэка).* У бібліятэцы была афармлена кніжная выстаўка «Салдаты Афгана», інфармацыйны фота-стэнд «Час выбраў нас», адбылася сустрэча з былым воінам-інтэрнацыяналістам *Ю. Д. Сіняковым*.

19 лютага Фальклорнае свята «Бабулін куфэрак», прысвечанае Міжнароднаму дню роднай мовы *(Курынская сельская бібліятэка)*.

21 лютага Вечар беларускай паэзіі «Гучы, мая родная мова» *(Шапечынская сельская бібліятэка).*

27 лютага Тэматычны вечар «Паэзія ў Бібліі і Біблія ў паэзіі» з удзелам паэта-барда *А. Іванова*, мастака *У. Вальнова*, журналіста *Г. Каржанеўскага*, кіраўніка эстэтычнага салона «Оли-art» пры Віцебскай абласной бібліятэцы *У. І. Джарыяні*.

26 лютага да 95-годдзя П. М. Машэрава ў бібліятэках-філіялах Віцебскай РЦБС прайшлі гутаркі «Помніць сына Радзіма», «Феномен Пятра Машэрава» *(Курынская, Замастоцкая, Бабініцкая сельскія*

музыкі» Вусценскага Дома культуры Аршанскага раёна.

Аршанская газета. – 2013. – 5 лют. – С. 3.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

Культура Індыі была прадстаўлена **9 лютага** ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”». У свяце прынялі ўдзел самадзейныя калектывы індыйскага танца з Віцебска і Мінска. Яны выконвалі класічныя народныя харэаграфічныя пастаноўкі, быў паказаны спектакль па матывах старажытнага эпасу Індыі.

Народнае слова. – 2013. – 14 лют. – С. 9.

Раённае свята народных талентаў «А музыкі граюць, граюць…» прайшло ў в. Бычыха Гарадоцкага раёна, мерапрыемства было прысвечана памяці віртуознага майстра-гарманіста Івана Іванавіча Іўлева.

Гарадоцкі веснік. – 2013. – 26 лют. – С. 2.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна

4 лютага ў аддзеле літаратуры па мастацтве адбылася прэзентацыя кнігі старшыні мастацка-эстэтычнага салона «Оли-art» *У. І. Джарыяні* «Наш выбор: из истории тбилисского клуба “Ракурс”».

5 лютага ў аддзеле эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры прайшла сустрэча «И саду нужен свой Карден» з вядомым віцебскім садаводам, кандыдатам сельскагаспадарчых навук *М. Г. Шломам*.

7 лютага прайшла творчая сустрэча з пісьменнікам, гісторыкам *Уладзімірам Арловым*, які прэзентаваў прысутным свае новыя выданні «Краіна Беларусь: ілюстраваная гісторыя» і «Краіна Беларусь. Вялікае Княства Літоўскае». У гэты ж дзень чытачоў запрасілі на разгорнутую выстаўку-прагляд новых паступленняў кніг аддзела абанемента «Запрашаем у свет навінак».

11 лютага адбылося пасяджэнне калегіі ўпраўлення культуры

Віцебскага аблвыканкама па выніках работы за 2012 год. Супрацоўнікі Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна падрыхтавалі да мерапрыемства кніжную выстаўку. У экспазіцыі была прадстаўлена літаратура, якая адлюстроўвае багатае тэатральнае, мастацкае і музейнае жыццё Прыдзвінскага краю, а таксама бібліяграфічныя і інфармацыйныя выданні абласной бібліятэкі.

13 лютага ў агульнай чытальнай зале адбыўся вечар памяці «С чувством личной причастности», падрыхтаваны супрацоўнікамі аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі да 24-й гадавіны вываду савецкіх войск з Афганістана. На мерапрыемстве прысутнічалі ўдзельнікі баявых дзеянняў у Рэспубліцы Афганістан, іх жонкі і матулі, удовы загінуўшых, жаночы савет афганскага таварыства «Братство», дэсантнікі 103-й асобнай гвардзейскай мабільнай брыгады, супрацоўнікі музеяў, педагогі, бібліятэкары, прадстаўнікі СМІ, студэнты і школьнікі.

Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк

21 лютага Літаратурна-музычная кампазіцыя да Міжнароднага дня роднай мовы «Дык шануй святыя словы беларускай роднай мовы» *(цэнтральная бібліятэка імя М. Горкага)*.

21 лютага Сустрэча з папулярнымі аўтарамі *Н. Батраковай* і *Т. Лісіцкай* «Верить. В себя и… в любовь».

26 лютага Вечарына памяці «Подзвіга бессмяротны палёт» з удзелам старшыні Віцебскай абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» *В. А. Мацкевіча*.

Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

12 лютага Урок здароўя для прадстаўнікоў ГА «Беларуская асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму» «Крыніца здароўя» *(бібліятэка імя К. Сіманава).*

18 лютага Сустрэча з наваполацкім паэтам *Ф. Фядотавым*, прэзентацыя новай кнігі аўтара «На маёй радзіме Беларусі…» *(дзіцячая*

бібліятэка імя С. Маршака).

21 лютага Акцыя «Размаўляй са мной па-беларуску» *(дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака).*

З **26 лютага** ў бібліятэцы імя Я. Коласа пачалася акцыя па зборы матэрыялаў пра вядомых ураджэнцаў «Навапалачане самыя-самыя: аргументы і факты».

Полацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

2 лютага Відэападарожжа для людзей сталага ўзросту «Путешествие по Европе: Рим» *(цэнтральная бібліятэка імя Ф. Скарыны)*.

14 лютага Экалагічны турнір «В гостях у Тошки» *(дзіцячая бібліятэка імя Л. М. Талстога).*

15 лютага Літаратурная кампазіцыя «Не мы судьбу – судьба нас выбирала» ў гонар памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў *(цэнтральная бібліятэка імя Ф. Скарыны)***.**

Бешанковіцкая раённая сетка публічных бібліятэк

20 лютага Тэматычны вечар «Прикосновение к подвигу», прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння *Л. М. Даватара (цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк

З **18** па **27 лютага** ў Відзаўскай гарпасялковай бібліятэцы правялі дэкаду роднай мовы, у рамках якой адбылася акцыя «Час чытаць на роднай мове», прайшло бліц-апытанне «Што я прачытаў на роднай мове», краязнаўчы калейдаскоп «Адкуль наш род і наша мова?» і інш.

19 лютага Круглы стол «Бібліятэкі Браслаўшчыны: вынікі, праблемы, перспектывы» з удзелам бібліятэкараў раёна. Падчас сустрэчы былі разгледжаны вынікі работы бібліятэк за 2012 год, адбыўся абмен вопытам работы, аб’яўлены ўмовы раённых конкурсаў на 2013 год і інш.